ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт

№ 8 (946) | АЎТОРАК, 21 красавіка 1998 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## НОВЫЯ ГАРЫЗОНТЫ АКАДЭМІЧНАЙ НАВУКІ

9 красавіка прайшла сесія агульнага сходу Нацыянальнай акадэміі навук нашай краіны. Гэты галоўны форум вядучых вучоных Беларусі меў адну гістарычную адметнасць. Ён праходзіў адразу ж пасля таго, як НАН набыла новы статус. Прэзідэнт А.Р.Лукашэнка падпісаў Указ "Аб Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі" і прыняты адпаведны закон, якія вызначылі больш уздзейнічаючую ролю галоўнай навуковай арганізацыі ў нашай незалежнай суверэннай дзяржаве.

На справаздачнай сесіі размова вялася аб многім: агульнадзяржаўных і больш прыватных навуковых праблемах, аб фінансаванні, поспехах і няўдачах, укараненні навуковых распрацовак і акупнасці ўкладваемых у даследаванні сродкаў, аб кадрах, пераемнасці і інш.

На сесіі актыўна абмяркоўваўся і такі прынцыпова важны для будучай работы вучоных дакумент, як "Асноўныя напрамкі павышэння эфектыўнасці выкарыстання навуковага патэнцыялу і матэрыяльна-тэхнічнай базы НАН Беларусі". Гэта праграма прадугледжвае стратэгічны план развіцця Нацыянальнай акадэміі навук на бліжэйшыя 5-10 гадоў.

Сярод выступіўшых на сесіі быў і рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Л.А.Шамяткоў. У яе рабоце прыняў удзел таксама загадчык кафедры педагогікі акадэмік НАН Беларусі І.Ф.Харламаў.

## ЗРОБІМ ГОМЕЛЬ УЗОРНЫМ ГОРАДАМ!

***У сакавіку г.г. старшынёй Гомельскага гарадскога выканаўчага камітэта стаў былы першы намеснік старшыні аблвыканкома дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь А.С.Якабсон. У пачатку бягучага месяца ён даслаў ліст на імя рэктара нашага універсітэта Л.А.Шамяткова. У допісе, у прыватнасці, паведамляецца:***

"Гомель становіцца ўсё больш адкрытым для нашых дзелавых партнёраў і гасцей з іншых гарадоў рэспублікі, а таксама дзяржаў блізкага і далёкага замежжа. 4-5 мая ў г.Гомелі будзе праходзіць сесія Парламенцкага Сходу Саюза Беларусі і Расіі. Прынята рашэнне аб стварэнні ў паўночна-усходняй частцы горада свабоднай эканамічнай зоны "Гомель-Ратон". Урадам рэспублікі ў цяперашні час разглядаецца пытанне аб наданні нашаму гораду статуса грамадска-палітычнага цэнтра міжрэгіянальных сувязяў, што, несумненна, павысіць яго прэстыж і будзе садзейнічаць развіццю прыгранічнага супрацоўніцтва і інтэграцыі славянскіх народаў у цэлым. Названыя акалічнасці ўскладваюць яшчэ большую адказнасць на ўсіх нас. Перакананы, што з улікам вышэйсказанага кожнаму гараджаніну было б асабліва прыемна бачыць Гомель узорным горадам з чыстымі дагледжанымі вуліцамі і ўтульнымі дварамі. Гарадскія ўлады будуць рабіць усё магчымае для добраўпарадкавання горада, але, на жаль, бюджэт крайне абмежаваны і выдзяляемых на гэтыя мэты сродкаў катастрафічна не хапае".

А.С.Якабсон выказаў упэўненасць, што калектыў універсітэта не застанецца раўнадушным да агульнагарадскіх праблем і ўнясе свой дастойны ўклад у добраўпарадкаванне нашага горада.

*Размеркаванне маладых спецыялістаў*

## РАБОТА БУДЗЕ ЎСІМ

Каля 800 студэнтаў нашага універсітэта -- на парозе самастойнага працоўнага жыцця. Нядаўна яны перажывалі хвалюючыя моманты: ішло размеркаванне сёлетніх маладых спецыялістаў. Непрыкметна для іх праляцеў час -- незабыўныя студэнцкія гады. А за імі надыходзіць пара сур'ёзная і адказная -- педагагічная праца, а таксама ў розных установах, арганізацыях, на прадпрыемствах.

Як паведамілі нам у аддзеле кадраў па студэнтах, практычна ўсе выпускнікі ГДУ атрымалі сёлета накіраванні на работу. З 497 пяцікурснікаў педагагічных спецыяльнасцей згодна заяўкі Міністэрства адукацыі 316 паедуць працаваць у розныя раёны нашай вобласці. У сярэдніх школах г.Гомеля будуць выкладаць 75 маладых спецыялістаў, у ВНУ, тэхнікумах, прафтэхвучылішчах -- 13 чалавек.

Свабоднае працаўладкаванне дазволена 49 юнакам і дзяўчатам, якія маюць на гэта поўнае права згодна дзеючага заканадаўства і Палажэння аб размеркаванні маладых спецыялістаў.

Не застануцца без працоўных месцаў і выпускнікі вытворчых спецыяльнасцей.



**На здымку:** выпускніца эканамічнага факультэта спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве" Марына Булавік, якая за выдатныя поспехі ў вучобе была ўдастоена стыпендыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, атрымала накіраванне на работу ў ААТ "Гомельшпалеры".

**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

## АБРАНЫ АКАДЭМІКАМ

У наш універсітэт прыйшла прыемная вестка. Загадчык кафедры філасофіі доктар філасофскіх навук, прафесар У.М.Калмыкоў абраны правадзейным членам Міжнароднай акадэміі акмеалагічных навук, цэнтр якой знаходзіцца ў г.Санкт-Пецярбургу. На імя вучонага дасланы адпаведныя Дыплом і пасведчанне.

## ВЕДАЙ НАШЫХ!

З І фестывалю маладзёжных тэатраў эстрадных мініяцюр, які праходзіў у г.Рагачове, вярнуліся два універсітэцкія калектывы -- СТЭМ "Сантэхэлектрамантаж" (кіраўнік Ю.І.Капоця) і тэатр-студыя "Если бы..." (рэжысёр Г.І.Воронін).

Яны паказвалі сваё майстэрства разам з яшчэ чатырмя калектывамі Гомельшчыны. Экспертная група фестывалю высока ацаніла выступленні прадстаўнікоў ГДУ, вызначыла для іх спецыяльныя намінацыі, узнагародзіла Дыпломамі.

## У КНІЗЕ "ПАМЯЦЬ"

***У выдатным паліграфічным выкананні ўбачыла свет кніга "Памяць" аб Веткаўскім раёне. У раздзеле "Знакамітыя земляки" змешчаны фотаздымкі з кароткімі біяграфічнымі дадзенымі і звесткамі аб навуковай дзейнасці трох вучоных нашага універсітэта: першага прарэктара, прафесара М.В.Селькіна, прарэктара па вучэбнай і выхаваўчай рабоце, кандыдата філалагічных навук М.М.Воінава і дэкана факультэта павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, кандыдата геаграфічных навук А.А.Малахава.***

## РЭКАМЕНДАВАЛА КОНКУРСНАЯ КАМІСІЯ

Пад старшынствам прарэктара па навуковай рабоце прафесара Д.Р.Ліна адбылося пасяджэнне конкурснай камісіі па вылучэнню кандыдатаў на штогадовыя Скарынаўскія чытанні. Савету універсітэта для зацвярджэння рэкамендаваны навуковыя працы дацэнтаў А.Ф.Васільева з кафедры алгебры і геаметрыі, Г.М.Каропы з кафедры геаграфіі, У.І.Коваля з кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства, А.Р.Міроціна з кафедры вышэйшай матэматыкі, старшай выкладчыцы кафедры бухуліку, кантролю і аналізу гаспадарчай дзейнасці В.В.Кавальчук.

Скарынаўскія чытанні з уручэннем іх лаўрэатам дыпломаў і прэмій адбудуцца на майскім пасяджэнні Савета універсітэта.

## УНЕСЛІ СВОЙ УКЛАД

Стала добрай і даўняй традыцыяй з прыходам вясны праводзіць масавыя суботнікі па добраўпарадкаванню гарадоў і населеных пунктаў. Сёлета галоўнае свята працы было прызначана на 11-га красавіка. Але ў нашым універсітэце яно пачалося яшчэ раней. Першымі на ачыстку замацаванай тэрыторыі выйшлі выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты геолага-геаграфічнага факультэта. Гэта прадугледжвалася іх праграмай, прымеркаванай да прафесійнага свята -- Дня геолага. Пад кіраўніцтвам намесніка дэкана Ю.П.Іванова імі выкананы значны аб'ём работ.

Свой уклад у агульнанародную справу ўнеслі і калектывы астатніх факультэтаў і структурных падраздзяленняў універсітэта. Цяпер прыкметна пасвятлела і стала больш утульна ў вучэбных карпусах і інтэрнатах, наведзены належны парадак на прылягаючых да іх плошчах.

Усе работы па добраўпарадкаванню ва універсітэце праводзіліся па графіку.

**Факт без каментарыя**

## САНАТОРЫЙ-ПРАФІЛАКТОРЫЙ -- ТОЛЬКІ ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

Універсітэцкая здраўніца, у якой за ўвесь час яе існавання маглі падмацоўваць сваё здароўе студэнты, а таксама ўсе жадаючыя члены калектыву ГДУ, спыніла выдачу пуцёвак і курсовак выкладчыкам і супрацоўнікам. З нядаўняга часу тут маюць права аздараўляцца выключна адны студэнты. Такое распараджэнне атрымана галоўным урачом санаторыя-прафілакторыя з Гомельскага абласнога ўпраўлення па аздараўленню. Матывуецца рашэнне тым, што сродкі на ўтрыманне санаторыяў-прафілакторыяў выдзяляюцца фондам сацыяльнага страхавання толькі для студэнтаў.

## З УЗНАГАРОДАЙ !

*За дасягнутыя поспехі ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў, высокія навуковыя вынікі, актыўную грамадскую дзейнасць і ў сувязі з прафесіянальным святам -- Днём геолага Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны прафесар кафедры геаграфіі ВАХРУШАЎ Валянцін Аляксандравіч і дацэнт кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў, намеснік дэкана геолага-геаграфічнага факультэта ІВАНОЎ Юрый Паўлавіч.*

***

*За плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці і ў сувязі з 50-годдзем з дня нараджэння Ганаровымі граматамі універсітэта ўзнагароджаны загадчык кафедры ВМ і праграміравання доктар тэхнічных навук, прафесар МАЖАРОЎСКІ Валянцін Васільевіч і кандыдат філасофскіх навук, дацэнт кафедры палітычнай сацыялогіі КАСЬЯНЕНКА Анатоль Пятровіч.*

ПРАЕКТ

# ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ НА І КУРС ЗАВОЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА на 1998-1999 НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Ва універсітэт прымаюцца асобы, якія маюць сярэднюю адукацыю і пастаянна пражываюць у рэспубліцы, грамадзяне Беларусі і беларусы, якія пражываюць за яе межамі, а таксама грамадзяне Расійскай Федэрацыі. Указаныя грамадзяне маюць права атрымаць на конкурснай аснове бясплатную вышэйшую адукацыю ва універсітэце, калі адукацыя дадзенага ўзроўню атрымліваецца ўпершыню. Грамадзяне іншых краін здаюць уступныя экзамены, удзельнічаюць у конкурсе і прымаюцца на аснове дагавораў з аплатай навучання.

Універсітэт ажыццяўляе прыём студэнтаў звыш плана прыёму на ўмовах дагавораў з аплатай юрыдычнымі або фізічнымі асобамі. На месцы звыш плана прыёму, колькасць якіх устанаўліваецца прыёмнай камісіяй, залічваюцца абітурыенты, якія станоўча здалі ўступныя экзамены, але не прайшлі па конкурсу ва універсітэт або іншую ВНУ пры ўмове здачы адпаведных экзаменаў, незалежна ад іх формы, а таксама па выніках субяседавання па прадметах уступных экзаменаў і па сярэдняму балу адзнак дакументаў аб сярэдняй адукацыі. Субяседаванне праводзіцца з **25 па 28 жніўня.**

Прыём заяў – з **25 красавіка па 13 чэрвеня.** Уступныя экзамены -- з **16 па 28 чэрвеня.** Залічэнне ў студэнты: па плану – **да 5 ліпеня**, на ўмовах аплаты – **да 1 верасня.**

Паступаючыя на ўсе спецыяльнасці здаюць 3 конкурсныя экзамены. Абітурыенты, якія не з'явіліся на экзамен без уважлівых прычын або атрымалі нездавальняючую адзнаку, да далейшых экзаменаў не дапускаюцца. Уступныя экзамены праводзяцца па праграмах, складзеных у адпаведнасці з вучэбнымі праграмамі агульнай сярэдняй адукацыі і зацверджаных Міністэрствам адукацыі.

Абітурыенты здаюць наступныя ўступныя экзамены ( гл. табліцу).

| NN | Спецыяльнасць | Экзамены |
|---|---|---|
| 1. | **Руская мова і літаратура** | 1. Руская мова і літаратура (дыктоўка).<br>2. Руская мова і літаратура (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура (вусна). |
| 2. | **Беларуская мова і літаратура** | 1. Беларуская мова (дыктоўка).<br>2. Беларуская мова і літаратура (вусна).<br>3. Руская мова і літаратура (вусна). |
| 3. | **Матэматыка** | 1. Матэматыка (вусна).<br>2. Матэматыка (пісьмова).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (ізлажэнне). |
| 4. | **Бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт** | -//- |
| 5. | **Эканоміка і кіраванне на прадпрыемстве** | -//- |
| 6. | **Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі** | 1. Матэматыка (вусна).<br>2. Фізіка (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (ізлажэнне). |
| 7. | **Гісторыя** | 1. Гісторыя Беларусі (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 8. | **Правазнаўства** | -//- |
| 9. | **Геаграфія** | 1. Геаграфія (вусна).<br>2. Замежная мова (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 10. | **Біялогія** | 1. Біялогія (вусна).<br>2. Хімія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (сачыненне). |
| 11. | **Фізічная культура і спорт** | 1. Экзамен па спецфізпадрыхтоўцы.<br>2. Біялогія (вусна).<br>3. Беларуская мова і літаратура або руская мова і літаратура (ізлажэнне). |

Залічэнне ва універсітэт праводзіцца па конкурсу ў адпаведнасці з колькасцю балаў, набраных абітурыентамі на ўступных конкурсных экзаменах. У першую чаргу залічваюцца:

-- выпускнікі сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў, якія паступаюць на адпаведныя або родасныя спецыяльнасці;

-- асобы, якія працуюць па профілю абранай спецыяльнасці не менш шасці месяцаў;

-- слухачы падрыхтоўчага аддзялення.

На месцы, якія засталіся, залічваюцца іншыя асобы.

Асобы, якія закончылі падрыхтоўчае аддзяленне, залічваюцца ў адпаведнасці з палажэннем аб ім.

Па-за конкурсам пры атрыманні станоўчых адзнак на ўступных экзаменах залічваюцца:

-- воіны-інтэрнацыяналісты;

-- круглыя сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў;

-- дзеці з сем'яў загінуўшых (памёршых) або стаўшых інвалідамі ў час праходжання воінскай службы або работы ў складзе савецкіх войск на тэрыторыі дзяржаў, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, загінуўшых (памёршых) у мірны час пры праходжанні воінскай службы;

-- інваліды І і ІІ груп, якім у адпаведнасці з заключэннем медыка-рэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказана навучанне ў ВНУ і якія могуць наведваць заняткі;

-- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з арт.18 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

-- суайчыннікі з іншых краін па рэкамендацыях беларускіх арганізацый і навучальных устаноў замежжа на спецыяльна выдзеленыя месцы.

Пры роўнасці конкурсных балаў перавагу маюць:

-- медалісты школ, выдатнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і ПТВ на аснове базавай школы, а таксама выдатнікі ПТВ на аснове сярэдняй школы пры паступленні на спецыяльнасці, якія адпавядаюць атрыманым прафесіям;

-- інваліды ІІІ групы пры адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў;

-- асобы, якія маюць ільготы ў адпаведнасці з артыкуламі 19, 20, 23, 24, 25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС";

-- прафесіянальна арыентаваныя абітурыенты (закончылі факультэт падрыхтоўкі да паступлення ў ВНУ і прафарыентацыі, маюць стаж работы па спецыяльнасці, якая адпавядае абранай, або іншую прафесіянальную арыентацыю);

-- звольненыя ў запас ваеннаслужачыя, якія маюць ільготы, устаноўленыя заканадаўствам, і рэкамендацыі воінскіх часцей;

-- асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш 2 гадоў;

-- абітурыенты, у якіх маці або бацька інваліды, або абітурыенты з мнагадзетных сем'яў.

Для атрымання другой вышэйшай адукацыі прымаюцца асобы на ўмовах поўнай аплаты навучання. Парадак залічэння гэтых асоб вызначаецца адпаведным палажэннем.

Паступаючыя ва універсітэт падаюць наступныя дакументы:

-- заяву на імя рэктара;

-- дакумент аб сярэдняй адукацыі ў арыгінале;

-- 6 чорна-белых фотакартак памерам 3 х 4 см;

-- медыцынскую даведку па форме 086/У;

-- выпіску (копію) з працоўнай кніжкі ( для асоб, якія знаходзяцца на ўліку ў службе занятасці насельніцтва, -- дакумент, які сведчыць аб гэтым);

-- дакументы, якія пацвярджаюць права карыстання льготамі;

-- пашпарт ( прад'яўляецца ў прыёмную камісію па прыбыцці ва універсітэт).

Усе іншыя пытанні, звязаныя з прыёмам, канчаткова вырашаюцца прыёмнай камісіяй універсітэта на падставе заканадаўства Рэспублікі Беларусь і "Парадку прыёму ў дзяржаўныя вышэйшыя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь на 1998 год".

Апеляцыі па пытаннях экзаменацыйных адзнак падаюцца адказнаму сакратару прыёмнай камісіі на імя рэктара ў дзень правядзення вуснага экзамена або ў дзень аб'яўлення адзнакі па пісьмоваму экзамену.Паўторная здача экзамена не дазваляецца.

Дакументы накіроўваць на адрас:246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104, Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, прыёмная камісія. Тэлефоны: 57-69-17 (адказны сакратар), 57-82-56 (прыёмная камісія).

**ПРЫЁМНАЯ КАМІСІЯ.**

## ЭКЗАМЕНЫ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАЙ ФІЗІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎЦЫ

Зыходным палажэннем экзаменаў па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы з'яўляецца вызначэнне ўзроўню агульнафізічнай падрыхтаванасці і рухальнага апарату абітурыентаў.

Здача экзаменаў пачынаецца з заліку па плаванню і пры паспяховай яго здачы абітурыенты працягваюць здаваць экзамен па спецыяльнай фізпадрыхтоўцы. Ён уключае нарматывы і патрабаванні спартыўнага шматбор'я, у якім прадугледжана выкананне чатырох абавязковых відаў фізічных практыкаванняў у адпаведнасці з існуючымі правіламі спаборніцтваў.

Вынік кожнага віду фізічных практыкаванняў ацэньваецца ў заліковых балах /гл.табліцу/. У табліцы таксама паказаны нарматывы і патрабаванні да заліку па плаванню. Дыстанцыю можна праплысць адным з існуючых стыляў плавання, прадугледжаных спартыўнай класіфікацыяй.

Неабходна адзначыць, што выкананне любога спартыўнага нарматыву чатырохбор'я ніжэй заліковага ацэньваецца двума /"2"/ баламі, якія не з'яўляюцца заліковымі і не ўваходзяць у агульную суму бальнай адзнакі за экзамен.

Такім чынам, адзнака па спецыяльнай фізічнай падрыхтоўцы складаецца з сумы вынікаў толькі заліковых балаў, набраных абітурыентам у спартыўным шматбор'і:

ад 18 да 20 балаў -- 5 /выдатна/;
ад 14 да 17 балаў -- 4 /добра/;
ад 10 да 13 балаў -- 3 /здавальняюча/.

Табліца

| Экзамены | Узрост | Нарматыўныя патрабаванні і заліковыя балы | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | мужчыны | | | жанчыны | | |
| СПЕЦФІЗПАДРЫХТОЎКА | | 5 | 4 | 3 | 5 | 4 | 3 |
| Лёгкая атлетыка: Бег 100м /сек/ | 17-29 | 12.6 | 13.1 | 13.6 | 14.5 | 15.5 | 16.5 |
| | 30 і болей | 13.0 | 13.5 | 14.0 | 15.0 | 16.0 | 17.0 |
| Бег 1000м /мін, сек/ | 17-29 | 3.05 | 3.10 | 3.20 | 3.52 | 4.10 | 4.30 |
| | 30 і болей | 3.15 | 3.25 | 3.35 | 4.10 | 4.30 | 5.00 |
| Кіданне гранаты /м/ | 17-29 | 48.0 | 44.0 | 38.0 | 32.0 | 27.0 | 22.0 |
| | 30 і болей | 45.0 | 41.0 | 35.0 | 27.0 | 22.0 | 18.0 |
| Падцягванне ў вісе на перакладзіне хватам зверху | 17-29 | 15 | 12 | 8 | - | - | - |
| | 30 і болей | 12 | 9 | 6 | - | - | - |
| згібанне і разгібанне рук ва ўпоры лежачы /згібанне рук не менш 90⁰, колькасць разоў/ | 17-29 | - | - | - | 28 | 22 | 14 |
| | 30 і болей | - | - | - | 22 | 18 | 11 |
| Плаванне 100м /мін, сек/ вольны стыль | 17-29 | | 2.02 | | | 2.08 | |
| | 30 і болей | | 2.12 | | | 2.18 | |
| брас | 17-29 | | 2.15 | | | 2.33 | |
| | 30 і болей | | 2.25 | | | 2.43 | |
| кроль на спіне | 17-29 | | 2.15 | | | 2.23 | |
| | 30 і болей | | 2.25 | | | 2.33 | |

*Германія вачамі нашай студэнткі*

# ЛЁС ПАДАРЫЎ ШЧАСЛІВЫ ШАНС

Нядаўна я вярнулася з пяцімесячнай стажыроўкі ў Германіі, дзе вучылася ў г.Вюрцбургу ва універсітэце імя Юліуса Максіміліяна (Заходняя Германія, Баварыя) разам з 18 студэнтамі Усходняй Еўропы (Украіны, Расіі, Польшчы, Югаславіі, Чэхіі, Славакіі, Балгарыі). Яны, як і я, былі накіраваны (ДААД) Нямецкай Службай Акадэмічных Абменаў на пяць месяцаў навучання менавіта ў гэты універсітэт на поўначы Баварыі.

Там, яшчэ ў 1870 годзе, вучыўся знакаміты фізік Рэнтген. У Вюрцбургу ён і вынайшаў свае "рэнтгенаўскія" промні.

А пачалося ўсё з маленькага артыкула ў газеце "Аргументы и факты для Беларуси" аб конкурсе для студэнтаў-германістаў 3-4 курса, якія могуць паспрабаваць свае сілы ў двух іспытах па нямецкай мове ў Мінскім лінгвістычным універсітэце і, пры пэўнай удачы, калі пашанцуе, могуць атрымаць месца і стыпендыю на 5 месяцаў у адным з універсітэтаў Германіі. Гэты конкурс праводзіцца адзін раз у год, восенню, па ініцыятыве Нямецкай Службы Акадэмічных Абменаў сумесна з Міністэрствам адукацыі Беларусі. Удзельнічаць у ім можа кожны студэнт, які мае неблагія веды па нямецкай мове. Акрамя таго, ёсць асобны конкурс для студэнтаў-матэматыкаў і эканамістаў, якія таксама павінны добра валодаць нямецкай мовай. Для іх стыпендыя будзе выплачвацца роўна год.

Рызыкнуўшы, я адважылася прыняць удзел у гэтым конкурсе і паехала ў Мінск для іспытаў, якія праводзяцца ў вуснай і пісьмовай формах.

Такіх, як і я, студэнтаў з розных куткоў Беларусі было ў той дзень чалавек пятнаццаць. Але ж гэта былі далёка не ўсе, так як экзамены доўжацца два тыдні і запісвацца на іх патрэбна загадзя, мінімум за месяц. Іспыты прымае лектар нямецкай Службы, немка, якая не мае права адразу ставіць адзнаку. Аб выніках можна даведацца толькі вясной наступнага года, таму што пісьмовыя работы правяраюць і ацэньваюць нямецкія прафесары ў Маскве, дзе і знаходзіцца галоўнае ведамства ДААД.



*На здымку: Вольга Мельнікава ў нямецкай бібліятэцы.*

Дарэчы, месцаў, якія выдзяляюцца для Беларусі, кожны год існуе толькі восем, і таму вытрымаць гэты конкурс было справай сапраўды не вельмі лёгкай.

Усю зіму я чакала адказу ад Нямецкай Службы Абменаў, і толькі ў канцы сакавіка мінулага года, калі я зусім ужо не спадзявалася на ўдачу, нечакана прыйшоў станоўчы адказ з Масквы. Вядома, радасці маёй не было мяжы!

Але ж, хоць я і ўказвала на некаторыя універсітэты ў Паўночнай Германіі (Ніжняй Саксоніі), з прафесарамі якіх у мяне ўжо ўсталявалася перапіска , -- да таго ж я ўжо некалькі разоў была ў гэтым кутку Германіі, і яна не здавалася мне невядомай, загадкавай і далёкай, -- усё ж такі я атрымала месца ва універсітэце г.Вюрцбурга ва Усходняй Франконіі. Ён знаходзіцца на поўначы Баварыі -- краіне піва і віна. У той жа універсітэт была накіравана яшчэ адна студэнтка з Мінска, астатнія былі раскіданы па Усходняй і Заходняй Германіі.

Вучоба пачалася з першага кастрычніка, але толькі для студэнтаў-іншаземцаў, так як яны павінны здаць экзамен на добрае валоданне нямецкай мовай.

Для нямецкіх жа студэнтаў пачатак вучобы -- першага лістапада, заканчэнне зімовага семестра ў канцы лютага. Затым ідуць два месяцы канікулаў, якія студэнты выкарыстоўваюць, у асноўным, для магчымасці падзарабіць -- стыпендыю атрымлівае, па статыстыцы, толькі кожны дваццаты студэнт. З мая па ліпень цягнецца летні семестр. І так штогод! Таму можна па праву сказаць, што вакацыямі нямецкія студэнты не абдзелены. Да таго ж яны яшчэ адпачываюць на калядных канікулах тры тыдні. Сесія ў зімовым семестры ў лютым, у летнім -- у ліпені. У гэты час трэба здаць усе пісьмовыя работы, рэфераты, якія павінны быць выкананы на камп'ютэры. Для гэтага патрэбна валодаць сучаснай тэхнікай: камп'ютэрам, факсам, ксераксам. Гэта ўсё на поўным размаху ў Германіі: кожны студэнт самастойна ксеракапіруе патрэбныя старонкі, самастойна адпраўляе факсы -- аўтаматы стаяць на кожным кроку, і, вядома ж, самастойна набірае тэкст на камп'ютэры і друкуе яго. Для гэтых патрэбаў ёсць спецыяльныя карткі, якія каштуюць кожная па дзесяць марак, і пры дапамозе сучаснай тэхнікі такім чынам аблягчаецца жыццё студэнтаў. Дазвол у вылічальны цэнтр можна набыць у выглядзе пластыкавай карткі за трыццаць марак на факультэце інфарматыкі. З такой карткай можна пастаянна наведваць цэнтр і ў ім працаваць. Адначасова кожны студэнт атрымлівае нумар электроннай пошты, які належыць толькі яму і з гэтай хвіліны можа пасылаць і атрымліваць карэспандэнцыю з усіх частак свету за лічаныя хвіліны, а таксама карыстацца паслугамі Інтэрнета і чытаць усе аб'явы, адным словам, усю інфармацыю.

Вучоба ў Германіі была для мяне таксама часам самастойнасці і выпрабавання. Трэба было самой купляць білет да Вюрцбурга, самой ставіць візу, уладкоўвацца ў інтэрнат, дзе жылі студэнты адусюль: немцы, французы, іспанцы, грэкі, партугальцы, балгары, датчане, кітайцы, японцы.

Пакой быў зарэзерваваны прафесарам нямецкай філалогіі спадаром Вольфам. Але ж прадстаяла вялікая мітусня і валакіта па ўсіх інстанцыях і бюракратычных установах Германіі, пакуль было ўсё афармлена.Я прапісалася ў г.Вюрцбургу, падпісала кантракты з установай па інтэрнатах на паўгода, каб атрымаць пакой, які, як заўсёды па ўсёй Германіі, даецца кожнаму студэнту асабісты: з душам, туалетам, электраплiткай, халадзільнікам, шафай, сталом, стулам і ложкам. Але пасцельныя рэчы не выдаваліся і давялося ўсё гэта купляць і па неабходнасці мыць у адной з чатырох пральных машын па чатыры маркі за раз.

Патрэбна было застрахавацца на ўвесь час навучання -- зноў жа атрымаўшы пластыкавую картку. На Захадзе кожны чалавек павінен штомесячна плаціць адной з вялікага мноства страхавых кампаній, тады наведванне ўсіх дактароў бясплатнае. Можна таксама за палову кошту атрымліваць некаторыя лекі па рэцэпту. Дарэчы, без страхоўкі нельга запісацца ва універсітэт, што патрэбна рабіць кожны семестр нанава і плаціць пры гэтым падатак на адукацыю. У кожнай федэральнай зямлі ён свой: у Баварыі -- 45 марак, у Ніжняй Саксоніі -- 70, а ў Бадэн-Вютэнбергу -- 170 за кожны семестр.

**Вольга МЕЛЬНІКАВА,**
**студэнтка гр.Н-44**
**філалагічнага факультэта.**
**(ЗАКАНЧЭННЕ БУДЗЕ).**



## СПАРТЫЎНАЯ АРБІТА

У Мінску прайшлі рэспубліканскія спаборніцтвы па вольнай барацьбе і армрэстлінгу (барацьба на руках за спецыяльным сталом) у праграме студэнцкай спартакіяды.

Прыемна адзначыць, што нашы спартсмены занялі першыя месцы ў агульнакамандным заліку. Гэтыя віды культывуюцца на кафедры фізічнага выхавання і спорту, якую ўзначальвае дацэнт В.А.Каляда.

***

У спорткомплексе "Гомсельмаш" завяршыўся чэмпіянат вобласці па жыму штангі лежачы (адзін з элементаў пауэрліфтынгу). Намеснік дэкана па выхаваўчай і спартыўнай рабоце матэматычнага факультэта майстар спорту Уладзімір Галавач і выпускнік факультэта фізічнай культуры Сяргей Гуцаў заваявалі сярэбраныя ўзнагароды.

***

У басейне гарспорткомплексу прайшлі спаборніцтвы па плаванню ў праграме гарадской спартакіяды ВНУ. Камандную перамогу святкавалі студэнты факультэта фізічнай культуры. На другім і трэцім месцах факультэт кіравання працэсамі перавозак і электратэхнічны факультэт БелДУТа.

***

У спорткомплексе БелДУТа адбыліся спаборніцтвы па гіравому спорту ў праграме гарадской спартакіяды ВНУ. На жаль, у тройцы прызёраў не "знайшлося" месца нашым факультэтам. Першае і трэцяе месцы дасталіся факультэтам БелДУТа. Другім прызёрам стаў лячэбны факультэт медінстытута.

Няўжо нашым студэнтам-мужчынам не сорамна прайграваць лячэбнаму факультэту, дзе навучаецца 90% дзяўчат?

**В.МАРЧАНКА.**



# ПА СТАРОНКАХ СПРАДВЕЧНАЙ МУДРАСЦІ

У канцы мінулага года з друкарні БелДУТа выйшла цікавая кніга доктара філалагічных навук У.В.Анічэнкі і дацэнта А.А.Станкевіч "Набожнае слова і антычная мудрасць крочаць побач", якая з'явілася вынікам трохгадовай плённай працы выкладчыкаў нашага універсітэта.

Кніга, прасякнутая жыццёвымі навучаннямі, якія маюць выключнае выхаваўчае значэнне, ужо знайшла свайго чытача: настаўніка, студэнта, вучня, абітурыента; 100 экземпляраў яе асабіста пажадаў набыць мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, патрыяршы экзарх усея Беларусі Філарэт.

Сістэматызаваныя трапныя выразы з евангельскіх і біблейскіх тэкстаў, а таксама мудрыя выказванні антычных вучоных закранаюць шматлікія дабрачыннасці: міласэрнасць, працалюбства, дружбу, каханне, справядлівасць, клопат пра бліжняга..., чаго так не хапае некаторым з нас.

Кніга, адрасаваная шырокаму колу чытачоў, складаецца з двух раздзелаў: набожнага слова, дзе змешчаны выразы з "Евангелля", выдадзенага Скарыны і антычнай мудрасці. Асаблівасць ілюстрацыйнага матэрыялу заключаецца ў паралельнай падачы евангельскіх тэкстаў на сучасных беларускай і рускай мовах, на старабеларускай мове Скарыны.

У І-й частцы першага раздзела кнігі (аўтар У.В.Анічэнка) вялікая ўвага надаецца прызнанню адказнасці чалавека за сваё становішча ў грамадстве. Другая частка звязана з яркай фігурай эпохі Адраджэння -- Францыскам Скарынам, волатам беларускай культуры, які надаваў важнае значэнне чалавечай мудрасці: " Без мудрасці і добрых звычаяў не пачціва жыць простым людзям на зямлі"; " Лепш мудрасць, чым воінская зброя".

Другі раздзел (аўтар А.А.Станкевіч), як і першы, падзелены на асобныя тэмы: "Разуменне прыроды", "Чалавек у грамадстве", "Жыццё -- смерць", "Праца -- занятак", "Паводзіны -- учынкі" і інш. Антычныя афарызмы і прыказкі падаюцца на лацінскай мове і перакладаюцца на беларускую і рускую (што вельмі зручна для філолагаў-першакурснікаў).

Можна здзівіцца, як хораша гучаць лацінскія выслоўі на беларускай мове, што дае падставу сцвярджаць аб яе прыдатнасці для перакладаў як біблейскіх тэкстаў, так і твораў старажытных аўтараў. Запамінальнымі застануцца для чытача выказванні Цыцэрона: "Цела маладых загартоўваецца працаю", "Праца прытупляе гора"; Гарацыя: "Гультайства -- падушка сатаны". Вельмі здзіўляешся, калі даведваешся, што выслоўе "Хто каго любіць, той таго чубіць" належыць Тэрэнцыю, рымскаму камедыёграфу.

Для больш поўнага асэнсавання кнігі чытач павінен адразу звярнуцца да прадмовы, якая накіруе яго думкі ў адпаведнае рэчышча і дапаможа правільна зразумець глыбінны сэнс старажытных запаветаў.

Праводзячы ўрок літаратуры, у якасці тэматычных эпіграфаў настаўнік можа з поспехам выкарыстаць адвечную мудрасць Сенэкі, Гарацыя, Эзопа...

**Дзмітрый БАЛМАЧЭНКА,**
**Іван КЛІМОВІЧ,**
**студэнты гр.Б-31**
**філалагічнага факультэта.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- дыферэнцыяльных ураўненняў -- дацэнта;

-- алгебры і геаметрыі -- дацэнта (2);

-- вышэйшай матэматыкі -- дацэнта;

-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- ст.выкладчыка;

-- оптыкі -- прафесара.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Калектыў АГЧ універсітэта выказвае глыбокае спачуванне каменданту вучэбнага корпуса №1 **ПАДАБЕДАВАЙ** Ганне Фёдараўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул. Савецкая, 1.

Рэдактар Ул.П.БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 168
Падпісана да друку 17.04.98.